# Пункцірам

✔ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Аляксандра Ціхановіча з 60-гадовым юбілеем. "Вы — адна з тых яркіх, заўважных творчых асоб, без якіх нельга ўявіць сабе сучасную беларускую музыку. Ваша творчасць — сапраўдны залаты фонд айчыннай эстрады, прыклад для маладых спевакоў і кампазітараў", — адзначыў Кіраўнік дзяржавы.

✔ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб ўганараванні дзяржузнагародамі прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. У тым ліку медаль Францыска Скарыны быў уручаны старшыні Мінскага гарадскога армянскага культурна-асветніцкага таварыства "Айастан" Георгію Егіазарану, артыстам Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г. Цітовіча і Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі". Ганаровае званне народнага артыста Беларусі нададзена артыстам балета, майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Вользе Гайко і Людміле Кудраўцавай. Заслужанай артысткай Беларусі стала артыстка Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Белдзяржфілармоніі Юлія Стэфановіч.

✔ Помнік Уладзіміру Мулявіну будзе ўсталяваны ў Екацярынбургу. Гэту ідэю падтрымаў міністр культуры Расіі Уладзімір Мядынскі на рабочай сустрэчы з міністрам культуры Беларусі Паўлам Латушкам падчас XXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Галоўнай тэмай гутаркі міністраў сталі пытанні далейшага ўзаемадзеяння ў сферы культуры.

✔ Выстаўка дзевятнаццацігадовага беларускага мастака Яраслава Сафонава, студэнта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, адкрылася ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлена 20 карцін філасофскага зместу пад агульнай назвай "Памяць". Мастак, нягледзячы на свой даволі малады ўзрост, ужо з'яўляецца лаўрэатам шэрагу міжнародных фестываляў і конкурсаў. Гэтая выстаўка для яго — сямнаццатая па ліку.

✔ Беларускія нацыянальныя строі і ручнікі з Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН экспануюцца ў Парыжы. Адкрыццё выстаўкі суправаджалася канцэртам класічнай музыкі з удзелам прафесійных беларускіх выканаўцаў. Экспазіцыя выклікала вялікі інтарэс у французскай інтэлігенцыі.

✔ У Чачэрску з'явіцца бібліятэка ў гонар заснавальніка горада графа Чарнышова. Яна будзе працаваць пры мясцовым гісторыка-этнаграфічным музеі. Аснову фондаў складуць творы аўтараў, якія жылі ў часы графа Чарнышова — у канцы XVIII — пачатку XIX стст. Стварэнне бібліятэкі прымеркавана да Года кнігі і 290-годдзя з дня нараджэння графа Захара Чарнышова.

Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-07-20

Падрыхтавала
**Ірына АЛЯКСАНДРАВА**